УДК 322:2-6(476)

# ЗМЕНЫ Ў РЭЛІГІЙНАЙ СФЕРЫ ЯК ЧАСТКА СІСТЭМНАЙ ТРАНСФАРМАЦЫІ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСІ

*В. А. АДЗІНОЧАНКА*

*Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны*

Укажам на абмежаванасць ужывання паняцця “рэлігійнай сфера”, як і наогул паняцця “сфера грамадскага жыцця”. Праз іх ствараецца вобраз замкнёнага фрагмента прасторы, адмежаванага ад наваколля. Таксама сфера прадугледжвае наяўнасць цэнтра і перыферыі, што не адпавядае характару сучаснага грамадства. Пры гэтым размова не ідзе аб няслушнасці гэтых паняццяў, яны прызначаны для дыферэнцаванага аналізу сацыяльнай рэчаіснасці. Але праблемным з’яўляецца іх анталагічны статус. Мы разглядаем іх ўжыванне як сродак аналізу для выяўлення аднаго з элементаў сацыяльнай сістэмы.

Сферны падыход распрацоўваецца ў сучасным грамадазнаўстве для пераадолення рэдукцыянізму марксісцкай сацыяльнай тэорыі, згодна з якой “базіс вызначае надбудову”. Зараз падкрэсліваецца самастойнасць розных спосабаў жыццядзейснасці. Пад сферай грамадскага жыцця разумеецца «кластар інстытутаў з наяўнымі ў іх матэрыяльнымі і кадравымі рэсурсамі, інфраструктурай, камунікацыямі, органамі кіравання і інш., аб’яднаных на аснове функцыянальнага прызначэння і адзінага прынцыпу сувязі элементаў у пэўную якасную цэласнасць, адрозную ад іншых грамадскіх формаў аб’яднання, але якія ўзаемадзейнічаюць з імі ў працэсах сістэмнага ўзнаўлення сацыяльнага грамадства (краіны-дзяржавы)» [1, с. 22].

Звычайна вылучаюць эканамічную, палітычную, сацыяльную і духоўную сферы. Мы ж лічым магчымым больш дэталёвы падыход і кажам таксама пра сферы мастацтва, маралі, рэлігіі і г. д. Гэта дае магчымасць аналізу разнаякасных працэсаў, якія адбываюцца ў сучасным беларускім грамадстве.

Рэлігійная сфера не з’яўляецца замкнёным утварэннем. Трэба, па-першае, указаць на яе цесныя сувязі з палітыкай, эканомікай, культурай; па-другое, акцэнтаваць увагу на тыя змены, якія ў ёй адбываюца ва ўмовах сучаснай Беларусі; і, па-трэццяе, пазначыць спосабы ўтварэння самога паняцця “рэлігійная сфера”. Мы яго разглядаем як адзінку аналізу пэўных форм жыццядзейнасці, якія вылучаем з сістэмы грамадства.

Пад сістэмай разумеецца сукупнасць элементаў, якія знаходзяцца ў адносінах і сувязях адзін з адным, і ўтвараюць пэўную цэласнасць. Спецыфіка сацыяльнай сістэмы заключаецца ў тым, што яна ўтвараецца праз узаемадзеянне людзей, груп і інстытутаў. З гэтага вынікае, што яна можа быць трансфармавана ў выніку змены сістэмы каштоўнасцяў, якой кіруюцца ў дадзеным грамадстве.

У сітуацыі трансфармацыі, што адбываецца ў сучаснай Беларусі, важна ўлічваць тое, што вызначальнай характарыстыкай сістэмы з’яўляецца так званы «сістэмны эфект», які заключаецца ў немагчымасці вывесці яе ўласцівасці з сумы

уласцівасцяў элементаў. Сістэма – гэта цэласнае ўтварэнне, якое валодае новымі якаснымі характарыстыкамі. У дачыненні да нашых разважанняў гэта дазваляе акцэнтаваць увагу на тым, што, па-першае, грамадства БССР і грамадства сучаснай Беларусі з’яўляюцца якасна рознымі сістэмамі; па-другое, рэлігія займае ў іх прынцыпова рознае становішча.

Нам трэба ўлічваць, што час, у які мы жывем, з’яўляецца вельмі спрыяльным для філасофскіх разважанняў, паколькі трансфармуюцца фундаментальныя характарыстыкі грамадства. У аспекце пpасторавага вымярэння раней мы былі часткай СССР, як палітычнай, эканамічнай і культурнай сістэмы, зараз жа зрабіліся самастойнай краінай са сваімі сістэмнымі характарыстыкамі.

Актуальным робіцца асэнсаванне рэлігійнай абумоўленасці культурнай спецыфікі Беларусі. Калі мы разгдядаем нашу краіну як тэрыторыю паміж Усходам і Захадам, асноўная ўвага надаецца ўплыву праваслаўя, з аднаго боку, і каталіцтва – з другога. Калі Беларусь успрымаецца як частка ўсходнеславянскай цывілізацыі, тады праваслаўе абвяшчаецца асноўным фактарам фарміравання нашай духоўнасці. Калі ж мы зыходзім з таго, што Беларусь з’яўляецца самастойнай дзяржавай, акцэнт робіцца на праблеме ўзаемадзеяння існуючых ў ёй розных рэлігійных кірункаў паміж сабой, з грамадствам і дзяржавай. Такім чынам, праз розныя спосабы ўтварэння сістэмы фарміруецца бачанне рэлігійнай сферы.

Трансфармацыя, якая вызначае характар сучаснай Беларусі, мае сістэмны характар. Таму пры яе аналізе неабходна ўлічваць працэсы ў эканамічнай, палітычнай, культурнай і таксама рэлігійнай сферах. Пры гэтым трэба больш-менш ясна сфарміраваць разуменне таго, што адбываецца, а таксама ад чаго і да чаго мы ідзем.

Як правіла, накірунак трансфармацыі пазначаецца наступным чынам: “камуністычная сістэма, якая на працягу доўгага часу трымала ў цісках амаль трэць чалавецтва, у рэшце рэшт рассыпалася, распалася і пакінула пасля сябе манументальныя развaліны, з-пад якіх падымаюцца вызваленыя грамадзяне, каб распачаць смелую спробу стварыць дэмакратычную палітыку, рынкавую эканоміку, плюралістычную культуру” [2, с. 9].

Пры гэтым трэба казаць не пра змены ў сістэме, але змену сістэмы. Мы можам ўзяць любую сферу нашага грамадскага жыцця, выявіць змены ў ёй і паказаць, як гэта суадносіцца з агульнымі тэндэнцыямі.

У рэлігійнай сферы змены найбольш відавочна праявілася ў росце колькасці зарэгістраваных арганізацый. За перыяд з 1988 г. па 2023 г. яна ўзрасла больш як у чатыры разы, з 765 да 3417. Трэба зыходзіць з таго, што гэтыя лічбы з’яўляюцца таксама паказчыкам якасных зменаў у грамадстве. Рост колькасці рэлігійных арганізацый з’яўляецца вынікам адмаўлення дзяржавы ад атэістычнай палітыкі. Насуперак тэорыям, сфармуляваным яшчэ ў XIX ст., выявілася, што рэлігійная сфера павінна разглядацца як неад’емны кампанент сучаснага грамадства. Пры гэтым неабходна зыходзіць з плюралістычнага характару апошняга. Яно не можа быць ні цалкам рэлігійным, ні цалкам атэістычным. Існуюць розныя стаўленні да рэлігіі: веруючых, няверуючых, індыферэнтных, скептыкаў атэістаў і г. д. Але фактам з’яўляецца тое, што ў Беларусі сфармавалася рэлігійная сфера як адна

з паўнапраўных і афіцыйна прызнаных абласцей грамадскага жыцця. Тэндэнцыі развіцця паказваюць, што яна будзе пашырацца, як у колькасным (павелічэнне лічбы разнастайных рэлігійных арганізацый), так і ў якасным (узмацненне ўплыву рэлігіі на грамадскае жыццё) плане.

Пры аналізе працэсаў, якія адбываюцца ў рэлігійнай сферы сучаснай Беларусі, прадуктыўна ўлічваць не толькі інстытуцыянальны, але і светапоглядны аспект.

Праведзеныя сацыялагічныя даследаванні паказваюць, што большасць насельніцтва адносіць сябе да розных хрысціянскіх напрамкаў: «праваслаўнага (84 %), каталіцкага (8,5 %), іншага (2,5 %)» [3, с. 104]. Але «актыўна паводзяць сябе ў рэлігійным плане толькі 8 % апытаных, у тым ліку ўвесь час прымаюць удзел у богаслужэннях – 5 %, адпраўленні ўсіх абрадаў і таінстваў – 3 %» [3, с. 105]. Мы лічым, што менавіта апошняя лічба, 3 %, можа выкарыстоўвацца ў якасці паказчыка рэлігійнасці насельніцтва Беларусі. Для большасці ж насельніцтва яна мае дэкларатыўны характер і ўспрымаецца як нешта пазітыўнае, але не звязанае са штодзённымі паводзінамі.

Тым не менш паказальны сам факт дэкларавання сваёй рэлігійнай прыналежнасці. Хрысціянства сфарміравала асноўныя ўстаноўкі нашай культуры. З асаблівай відавочнасцю гэта адчуваецца пры кантактах з прадстаўнікамі культур, у рамках якіх развіваліся іслам, будызм, індуізм і т. д.

Пры апісанні рэлігійнай сферы сучаснай Беларусі акцэнт трэба рабіць на яе поліканфесійнасць. Гэта адпавядае нашай гісторыі, а таксама сучаснаму стану. На пачатак 2023 г. у Беларусі зарэгістравана 25 рэлігійных кірункаў. Самымі шматкольнаснымі сярод іх з’яўляюцца: праваслаўе (1733 суполкі), хрысціяне веры евангельскай (525), каталіцтва (500), евангельскія хрысціяне-баптысты (282). У паліканфесійнасці заключаецца рэлігійная спецыфіка Беларусі. Мы не можам вылучыць рэлігійны кірунак, які з поўным правам можа прэтэндаваць на статус дамінуючага, як гэта назіраецца ў нашых суседзяў з усходу і захаду: Расіі (праваслаўе) і Польшчы (каталіцтва). Гэта яшчэ раз указвае на абмежаванасць ужывання паняцця “сфера рэлігійнага жыцця” у дачыненні да аналізу становішча ў сучаснай Беларусі. Мы не можам размеркаваць існуючыя ў ёй зарэгістраваныя рэлігійныя кірункі ў каардынатах “цэнтр-перыферыя”. Сучаснае беларускае грамадства прадуктыўна разглядаць як шматмерную сістэму. Кожны рэлігійны кірунак задае сваё вымярэнне. Напрыклад, праваслаўе звязвае нас з рускай культурай. Тым больш, што ў арганізацыйным плане праваслаўная царква ў Беларусі не з’яўляецца самастойнай, гэта частка Русскай праваслаўнай царквы. У той жа час, гісторыя праваслаўя на тэрыторыі Беларусі адрозніваецца ад гісторый рускага праваслаўя. Каталіцтва традыцыйна зближае нас з польскай культурай. Але зараз самі каталіцкія іерархі Беларусі робяць акцэнт на ўсеагульным характары царквы (грэч. *katholikos – усеагульны*). На становішча каталіцкай царквы ў Беларусі зараз асноўны ўплыў аказвае не тэрытарыяльна блізкая Польшча, але дзейнасць харызматычнага папы Францыска, былога аргентынскага кардынала.

Поліканфесійнасць ў рэлігійнай сферы сучаснай Беларусі будзе ўзмацняцца. Гэта прама звязана з ажыццяўленнем прынцыпа свабоды сумлення, замацаванага

ў 31 артыкуле Канстытуцыі: “Кожны мае права самастойна вызначаць свае адносіны да рэлігіі, асабіста або сумесна з іншымі вызнаваць любую рэлігію або не вызнаваць ніякай, выказваць і распаўсюджваць перакананні, звязаныя з адносінамі да рэлігіі, удзельнічаць у адпраўленні рэлігійных культаў, рытуалаў, абрадаў, не забароненых законам” [4, с. 10].

У гэтай сувязі трэба адзначыць, што змены ў рэлігійнай сферы Беларусі з’яўляюцца часткай трансфармацыйных працэсаў, якія вынікаюць са светапогляднага плюралізму сучаснага грамадства, што звязана з палітычнай свабодай, эканамічнай актыўнасцю і ажыццяўленнем творчасці ў культуры.

## Спісак літаратуры


1. Шавель, С. А. Сферная когерентность общества как императив его устойчивости и прогресса / С. А. Шавель // Журнал Белорус. гос. ун-та. Социология. – 2017. – № 3. – С. 12–23.

2. Штомпка, П. Социология социальных изменений / Пер. с англ, под ред. В. А. Ядова / П. Штомпка. – М. : Аспект Пресс, 1996. – 416 с.

3. Республика Беларусь в зеркале социологии : сб. материалов социол. исслед. за 2016 г. / А. В. Папуша [и др.] ; Информ.-аналит. центр при Администрации Президента Респ. Беларусь ; под общ. ред. А. П. Дербина. – Минск : Белорус. Дом печати. – 2017. – 209 с.

4. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 года (са змяненнямі і дапаўненнямі) : прынята на рэспубліканскіх рэферэндумах 24 лістапада 1996 года і 17 кастрычніка 2004 года (на беларускай, рускай мовах). – Мінск : Беларусь, 2006. – 96 с.



***Аннотация.*** Характер современного белорусского общества определяется процессом трансформации. Наиболее наглядно она проявилась в сфере религии. Официальное отношение к ней изменилось радикально. Происходит рост количества зарегистрированных религиозных организаций. Беларусь формируется как поликонфессиональная страна. Изменения в религиозной сфере являются частью системной трансформации. На них оказывает влияние общее состояние современного белорусского общества, и сами они вызывают изменения в других сферах общественной жизни.



***Ключевые слова***: религиозная сфера, трансформация, религиозность, поликонфессиональность, свобода совести.


CHANGES IN THE RELIGIOUS SPHERE AS PART OF THE SYSTEMIC TRANSFORMATION OF MODERN BELARUS


*Annotation.* The nature of modern Belarusian society is determined by the process of transformation. It manifested itself most clearly in the sphere of religion. The official attitude towards it has changed radically. There is an increase in the number of registered religious organizations. Belarus is being formed as a polyconfessional country. Changes in the religious sphere are part of a systemic transformation. They are influenced by the general state of modern Belarusian society, and they themselves cause changes in other areas of public life.



*Keywords*: religious sphere, transformation, religiosity, polyconfessionality, freedom of conscience.

**Сведения об авторе:**

**Одиноченко Виктор Александрович**, кандидат философских наук, доцент, доцент кафедры философии и специальных исторических дисциплин учреждения образования «Гомельский государственный университет им. Ф. Скорины».

Viktar Adzinochanka, Candidate of Philosophy, Associate Professor, Associate Professor of the Department of Philosophy and Special Historical Disciplines of the Gomel State University named after. F. Skorina.

УДК 364.642+316.363

# МЕХАНИЗМЫ ПОВЕДЕНИЯ ДЕТЕЙ И ВЗРОСЛЫХ В ПЕРИОД РАЗВОДА

*А. А. АНОХИНА*

*Ишимский педагогический институт им. П.П. Ершова (филиал) ТюмГУ*

*г. Ишим, Россия*

Для любого ребёнка мать и отец – это самые родные люди, от которых буквально зависит детское мировосприятие. Любые конфликтные ситуации между родителями отражаются на детях, но самые масштабные конфликты влияют намного сильнее – развод может напрямую отразиться на психике ребенка. Развод родителей для всех членов семьи является кризисом, разрушением привычной картины мира, изменением стиля жизни. Для ребенка это ещё и пересмотр внутренних привязанностей. Родители как будто становятся по разные стороны и, не редко, детям приходится делать выбор в чью-то пользу. Именно поэтому проявление любых детских реакций на развод родителей – норма здоровой психики. Ребенку необходимо как-то реагировать на происходящее.

Большинство людей, которые находятся на грани бракоразводного процесса, считают, что на ребёнка больше всего повлияет тот факт, что родители больше не живут вместе. Однако дети острее реагируют именно на конфликты, происходящие между мамой и папой. Такие ситуации способны вызвать у ребёнка самые сильные переживания, повлиять на развитие его характера и отразиться на будущем.

Наиболее значимым для психики ребенка является так называемый послеразводный период. Состояние родителей передается ребенку – страхи, напряжение, неуверенность и недовольство, испытываемые взрослыми, способны захватить детскую психику. В большинстве случаев, родители решают молчать о разводе, пытаясь уберечь ребенка от травмирующей информации. Однако внутреннее состояние родителей напрямую влияет на детей. В такой обстановке психика ребёнка пытается приспособиться к постоянному напряжению и страху – дети замыкаются в себе, врут, манипулируют, проявляют агрессию, отстраняются. Дети могут бояться возвращаться домой из образовательного учреждения, у них повышается тревожность и появляются страхи.